# БЕЛАРУСЫ Ў СВЕЦЕ

№1 (284)
студзень 2026

БАЦЬКАЎШЧЫНА

Інфармацыйны бюлетэнь • Супольнасць беларусаў свету “Бацькаўшчына”

## У НУМАРЫ:

### У Вільні адбылася сустрэча з Паўлам Севярынцам

У Вільні ў Доме нацыянальных меншасцяў 22 студзеня прайшла сустрэча з вядомым беларускім палітыкам, пісьменнікам і былым палітвязнем Паўлам Севярынцам. На яе завітала каля 50 чалавек.

Старонка 3

### Васіль Сегень: Сёлета будзем адзначаць 70-годдзе БГКТ

У Беластоку падчас урачыстасцяў з нагоды 20-й гадавіны Закона аб нацыянальных і этнічных меншасцях і рэгіянальнай мове былі ўручаны ганаровыя адзнакі Падляшскага ваяводства асобам, якія маюць асаблівыя заслугі ў падтрымцы нацыянальных і этнічных супольнасцяў.

Старонка 4

### Творчы вечар паэта Анатоля Галера прайшоў з аншлагам

14 студзеня ў Фарштадскай культурнай прасторы Цэнтра нацыянальных культур (вул. Відзэмес, 41а) адбылася творчая вечарына паэта і барда Анатоля Галера “Вершы як адлюстраванне душы”, прымеркаваная да 75-гадовага юбілею.

Старонка 6



| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 331. | Экстремистское формирование «Будзьма беларусамі!» | Экстремистское формирование «Будзьма беларусамі!» Маковская Елена Павловна, 01.07.1970 г.р. Шидловская Нина Анатольевна, 01.01.1974 г.р. | https://budzma.org; «Telegram»: https://t.me/budzmaorg ID 3276036191, @Suviaz_z_Budmaj_Bot @Budzma_razam_bot @BudmaBot @BudzmaSuviaz_Bot https://t.me/budzma_razam «Facebook» https://www.facebook.com/budzmabelarusami https://www.facebook.com/groups/490938217705523 https://www.facebook.com/alena.makouskaya; «ВКонтакте»: https://vk.com/budzmabelarusami https://vk.com/budzma «Instagram»: https://www.instagram.com/budzma https://www.instagram.com/al.makko; «Threads» https://www.threads.com/ «TikTok» https://www.tiktok.com/@budzma_razam | https://budzma.org; https://t.me/budzmaorg ID 3276036191, @Suviaz_z_Budmaj_Bot @Budzma_razam_bot @B @BudzmaSuviaz_Bot https://t.me/budzma_ra https://www.facebook.com/budzmabelarusa https://www.facebook.com/groups/49093821770 https://www.facebook.com/alena.makouskay https://vk.com/budzmabelarusami https://vk.com/ Страница 1 https://www.instagram.com/budzma https://www.instagram.com/al.makko; https://www.threads.com/ https://www.tiktok.com/@budzma_razam https://ok.ru/group/50897479139407 https://ok.ru/profile/124862515764; |

# “БУДЗЬМА!” ПРЫЗНАНАЯ ЭКСТРЭМІСЦКІМ ФАРМІРАВАННЕМ

Грамадская культурніцкая кампанія “Будзьма беларусамі!” прызнаная экстрэмісцкім фарміраваннем рашэннем МУС ад 29 студзеня 2026 года. Паводле рашэння, у спіс унесеныя культурна-асветны медыя-партал Budzma.org і ўсе старонкі “Будзьма беларусамі!” ў сацсетках, а таксама бот-афіша беларускіх мерапрыемстваў @Budzma_razam_bot.

У дакуменце ўказаны асабіста кaардынатаркі кампаніі Ніна Шыдлоўская і Алена Макоўская як асобы, якія маюць дачыненне да фарміравання.

У дакуменце паведамляецца: “Група грамадзян, якія ўваходзяць у экстрэмісцкае фарміраванне “Будзьма беларусамі!”, ажыццяўляе экстрэмісцкую дзейнасць”.

У пералік унесены:
- сайт budzma.org
- Facebook
- Youtube
- Instagram
- Threads
- X
- Tiktok
- бот-афіша беларускіх мерапрыемстваў @Budzma_razam_bot,
- тэлеграм-канал
- акаўнт у PayPal PayPal Zbsb.bel@gmail.com
- старонка для данатаў https://ko-fi.com/budzma
- лагатып “Будзьма беларусмі!” “ў выглядзе графічнага малюнка, які паказвае схематычнае адлюстраванне трох чалавечых сілуэтаў белага колеру на чырвоным фоне”.

Адрасы электроннай пошты, указаныя ў пераліку, не маюць дачынення да “Будзьма беларусамі!”.

Просім нашых чытачоў узяць пад увагу гэтую інфармацыю. Калі вы ў Беларусі або наведваеце Беларусь, чытайце і глядзіце “Будзьма беларусамі!” без падпіскі.

Кампанія “Будзьма Беларусамі!” ўжо 17 год працуе на тое, каб Беларусь стала бліжэй да кожнага з нас. А мы – бліжэй да Беларусі, і прызнанне экстрэмісцкім фарміраваннем нас не спыніць.

Мы працягваем працаваць і ствараць для вас цікавы беларускацэнтрычны кантэнт.

Калі вы лічыце гэта для сябе бяспечным, падтрымайце нас праглядамі, лайкамі і данатамі.

Будзьма беларусамі і будзьма разам!

budzma.org

НЕ ВАЙНЕ!

ВЫ МОЖАЦЕ ДАПАМАГЧЫ

навіны

# КАЛЯ 20 ІНСТЫТУЦЫЙ "ЗВЕРЫЛІ ГАДЗІННІКІ" НА ФОРУМЕ КУЛЬТУРНІЦКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ У ВАРШАВЕ

Магчымасці сумеснай супрацы, фінансаванне культуры і прамоцыю яе дасягненняў абмеркавалі на Форуме культурніцкіх арганізацый менеджары сектара. Падзея, якая прайшла 15–17 студзеня ў Музеі Вольнай Беларусі ў Варшаве, сабрала прадстаўнікоў каля 20 незалежных культурніцкіх інстытуцый.

Гэта ўжо трэці культурніцкі форум, які ладзіцца на розных пляцоўках і ў розных гарадах – гэтым разам да ўдзельнікаў аб'яднання ў Музеі Вольнай Беларусі далучыліся новыя чальцы.

У працы мерапрыемства ўзялі ўдзел прадстаўнікі Беларускай Рады культуры, Беларускага ПЭНа, Музея Вольнай Беларусі, Прадстаўніцтва па нацыянальным адраджэнні, фестывалю інтэлектуальнай кнігі PRADMOVA, Беларускага Свабоднага тэатра, праекта "Беларускія Магістраты", грамадскай арганізацыі "Годна", культурна-асветніцкага партала Budzma.org, выдавецтва Gutenberg Publisher, Беларускага інстытута публічнай гісторыі, Інстытута палітычных даследаванняў "Палітычная сфера", Беларускай сеткі фільммэйкераў, праекта "Культурны фронт" (Reform.news), Цэнтра беларускай культуры ў Беластоку, медыя Sekktor.Online, Беларускага інстытута тэатра ды іншых інстытуцый.

Нагадаем, што ініцыятыва стварэння Форуму належыць Беларускай Радзе культуры. Мэта сходу – сінхранізацыя дзейнасці культурных арганізацый, абмеркаванне пытанняў стратэгічнага развіцця, фінансавання і прамоцыі культуры, а таксама стварэнне прасторы для ўзаемападтрымкі.

Падчас першага дня ўдзельнікі зверылі культурніцкія "гадзіннікі": абмалявалі актуальныя выклікі, якія паўсталі перад арганізацыямі, а таксама падвялі вынікі за апошнія паўгода.

Другі дзень быў найбольш насычаным: на парадку дня стаяў аналіз мінулых і актуальных планаў, магчымасці сумесных праектаў. Абмяркоўвалі межы супрацы паміж незалежнымі інстытуцыямі: супрацоўніцтва – гэта патрэба ці опцыя? Якія знешнія дзеянні можна зрабіць сумесна? Як сінхранізавацца ўнутры поля з найбольшай карысцю?



На мінулым форуме ўдзельнікі звярталіся да такога фармату дыскусіі, як "пражарка" – калі прадстаўнік арганізацыі атрымлівае фідбэк і канструктыўную крытыку сваёй дзейнасці ад калег. Гэтым разам "пражарка" атрымалася "medium": вострай крытыкі не было, фармат дазволіў хутчэй даведацца больш пра дзейнасць саміх арганізацый і асаблівасці поля, у якім яны працуюць.

Таксама ў асобным блоку менеджары падзяліліся сваімі працоўнымі набыткамі і лайфхакамі. У прыватнасці, абмяркоўваліся змены ў польскім заканадаўстве, на якія варта звярнуць увагу. На трэці дзень у фокусе ўвагі апынулася тэма магчымасцяў, межаў і ўмоў фінансавання культуры з боку бізнесу.

У цэлым, трэці Форум культурніцкіх арганізацый можна назваць адным з найбольш адкрытых, жывых і канструктыўных. Удзельнікі адзначылі прастору бяспекі і даверу, якую ўдалося пабудаваць як арганізатарам падзеі, так і самім прадстаўнікам культурніцкага сектара.

Плануецца, што Форум культурніцкіх арганізацый будзе ладзіцца раз на паўгода. Далучыцца да мерапрыемства можна, запоўніўшы адпаведную форму.

reform.news

# ЦІХАНОЎСКАЯ І ЗЯЛЕНСКІ ЎПЕРШЫНЮ ПРАВЯЛІ ДВУХБАКОВУЮ СУСТРЭЧУ

Ціханоўская прапанавала прызначыць украінскага спецпасланніка па Беларусі. А Зяленскі запрасіў Ціханоўскую наведаць Кіеў.


t.me/tsikhanouskaya (Courtesy Photo)

Вечарам 25 студзеня ў Вільні сустрэліся беларуская дэмакратычная лідарка Святлана Ціханоўская і прэзідэнт Украіны Уладзімір Зяленскі, паведаміў тэлеграм-канал Святланы Ціханоўскай.

Ціханоўская ад імя беларусаў

- выказала поўную падтрымку ўкраінскаму народу,
- падзякавала Зяленскаму за моцную прамову на цырымоніі ўшанавання паўстанцаў 1863 года, значная частка якой была прысвечана беларусам,
- згадала беларускіх добраахвотнікаў, у тым ліку тых, што трапілі ў палон,
- партызанаў, незаконна асуджаных за падтрымку Украіны,
- прапанавала Украіне прызначыць спецпасланніка па Беларусі, а таксама шчыльней супрацоўнічаць з Місіяй дэмакратычных сілаў у Кіеве,
- падкрэсліла, што лёсы вольнай Беларусі і Украіны ўзаемазвязаныя.

Ціханоўская і Зяленскі таксама абмеркавалі санкцыі, супольную стратэгію ў Еўропе і ЗША, прыцягненне да адказнасці Лукашэнкі, і памагатых рэжыму, у тым ліку – за вываз украінскіх дзяцей.

Уладзімір Зяленскі запрасіў Ціханоўскую наведаць Кіеў.

svaboda.org

навіны

# У ВІЛЬНІ АДБЫЛАСЯ СУСТРЭЧА З ПАЎЛАМ СЕВЯРЫНЦАМ

У Вільні ў Доме нацыянальных меншасцяў 22 студзеня прайшла сустрэча з вядомым беларускім палітыкам, пісьменнікам і былым палітвязнем Паўлам Севярынцам. На яе завітала каля 50 чалавек.




Сустрэчу арганізаваў Віленскі беларускі клуб “Сябрына” на чале з Валянцінам Стэхам. На сустрэчы прысутныя змаглі паслухаць меркаванне Паўла наконт сітуацыі з Беларуссю і беларусамі, набыць яго каляндар, паштоўкі з выслоўямі і, вядома, задаць актуальныя пытанні палітыку. Самае кранальнае пытанне было ад сына Паўла – Францішка, а таксама адно з самых важных пра тое, якім чынам Беларусь можа атрымаць свабоду і ў тым ліку пра стаўленне да Палка імя Каліноўскага. Яго задаў былы добраахвотнік Палка імя Кастуся Каліноўскага Аляксандр Клачко.

На пытанне Павел Севярынец адказаў наступным чынам:

– Як я магу ставіцца да Кастуся Каліноўскага? Або як я магу ставіцца да Палка Каліноўскага? Канечне, я ўсёй душой і ўсім сэрцам з тымі людзьмі, якія ахвяруюць сабой дзеля свабоды нашай і нашых братоў. Няма любові большай чым, калі хто аддасць душу сваю за сяброў сваіх. Гэта тое, што робяць украінцы, гэта тое, што робяць многія беларусы ва Украіне, тое, што робяць каліноўцы. І тут дзвюх думак у беларусаў быць не можа.

Пытанне пра праблему з беларускай мовай у беларускай гімназіі і ў цэлым у Літве, супрацу з літоўскімі ўладамі беларускіх палітыкаў у гэтым кірунку падняў палітычны ўцякач з “Еўрапейскай Беларусі” Андрэй Квашэвіч:

– Я спадзяюся на новых людзей, такіх, як Павел Севярынец, іншыя сілы, што будзе ў нас нейкая новая хваля адносін з літоўскай уладай. Бо ніхто з імі, па вялікім рахунку, сур’ёзна не размаўляў. Я не думаю, што гэта вялікая праблема менавіта літоўскіх уладаў. Гэта наша праблема, што мы не можам дагрукацца да літоўскіх уладаў ці не жадаем дагрукацца. Спадзяюся, што з новымі людзьмі, з новай гэтай хваляй беларусаў мы дагрукаемся і вырашым пытанне.

Пасля пытання Квашэвіча Павел Севярынец запрасіў да сябе сваю жонку Вольгу і сына Францішка і адказаў, што з 23 студзеня яго сын ідзе ў Беларускую гімназію імя Францыска Скарыны, дзе будзе вучыць беларускую і літоўскую мовы.

Нагадаем, Павел Севярынец 13 снежня 2025 года быў вызвалены з гарадзенскай турмы і прымусова дэпартаваны з Беларусі. Агулам за сваё жыццё палітык правёў за кратамі больш за 11 гадоў, апошнім разам у засценках рэжыму ён адбыў 5,5 гадоў.

Павел Севярынец – аўтар 13 кніг, мноства артыкулаў і вершаў. У яго цяперашніх планах – напісаць яшчэ сем кніг.

racyja.com

# БАБАРЫКА СУСТРЭЎСЯ З ПРЫХАДЖАНАМІ ЦАРКВЫ Ў БЕРЛІНЕ, ДЗЕ ГОД ЗА ГОДАМ МОЛЯЦЦА ЗА БЕЛАРУСКІХ ПАЛІТВЯЗНЯЎ

“Апынуўшыся ў Германіі, я даведаўся пра простую, але вельмі чалавечную гісторыю”, – напісаў экс-палітвязень у сваім фэйсбуку.



“Пасля падзей 2020 года ў Гефсіманскай царкве ў Берліне з’явілася традыцыя: кожны чацвер увечары, год за годам, невялікая група людзей (ядро 4–6 чалавек) збіраецца разам, каб успомніць і памаліцца за палітзняволеных беларусаў. Амаль ніхто з іх не мае сувязі з Беларуссю, большасць – пажылога ўзросту, але ўсе яны людзі, здольныя спачуваць чужому гору і ўсведамляюць неабходнасць захавання памяці пра кожнага, нават чужога для сябе чалавека, які несправядліва асуджаны.

І я падумаў, што калі б ва ўмовах той ізаляцыі, у якой знаходзяцца многія палітзняволеныя, яны ведалі, што пра іх памятаюць нават чужыя людзі, гэта вельмі дапамагала б зняць псіхалагічны ціск. Паверце, адно з самых пакутлівых катаванняў – катаванне забыццём. Таму просьба да ўсіх, хто можа данесці асуджаным гэтую маленькую гісторыю – зрабіце гэта. Зняволеным гэта вельмі патрэбна”, – напісаў ён.

“Сёння (у чацвер) я быў у гэтай царкве і сустрэўся з гэтымі неверагоднымі людзьмі. На фота – адзін з іх. І мы дамовіліся, што я паспрабую зрабіць так, каб мая першая прамова на нямецкай мове, якую я змагу прачытаць (нават не сказаць), адбылася ў гэтай царкве. А ён выказаў жаданне пабываць у Беларусі і правесці апошнюю малітву за апошняга палітзняволенага на нашай радзіме (на жаль, не на нашай роднай мове). Вельмі хочацца, каб гэта не затрымалася і здарылася ўжо ў гэтым годзе.

А падарыла мне гэты цудоўны вечар і гісторыю выдатная жанчына Іна, адна з тых, хто складае сэрца гэтай групы і шчодра дзеліцца сваёй дабрынёй і дапамогай з беларусамі (і не толькі) у Германіі”, – дадаў Віктар Бабарыка.

nashaniva.com

навіны

# Васіль Сегень: СЁЛЕТА БУДЗЕМ АДЗНАЧАЦЬ 70-ГОДДЗЕ БГКТ

У Беластоку падчас урачыстасцяў з нагоды 20-й гадавіны Закона аб нацыянальных і этнічных меншасцях і рэгіянальнай мове былі ўручаны ганаровыя адзнакі Падляшскага ваяводства асобам, якія маюць асаблівыя заслугі ў падтрымцы нацыянальных і этнічных супольнасцяў.




Сярод уганараваных быў і старшыня Беларускага грамадска-культурнага таварыства (БГКТ) Васіль Сегень:

“Адзначэнне БГКТ – не выпадковае. Гэта самая старэйшая беларуская арганізацыя ў польскай краіне, якая дзейнічае амаль ужо 70 гадоў. У гэтым годзе будзем адзначаць менавіта такі юбілей. Тое, што на працягу гэтых дзесяцігоддзяў наша арганізацыя зрабіла – гэта, канечне, вялікі ўнёсак у развіццё нашай беларускай культуры ў Польшчы, культуры нашага рэгіёну, а нават можна і за межы Польшчы выйсці на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь”.

Акрамя Васіля Сегеня, ганаровыя гравертоны за дзейнасць на карысць нацыянальных меншасцяў атрымалі таксама беларускія культурныя дзеячы: Яўген Вапа, Андрэй Сцепанюк, Анатоль Вап, Алег Латышонак, Мікалай Бушко, Яўген Чыквін, Славамір Іванюк і Эльжбета Фіёнік.

racyja.com

# Дарафей Фіёнік: МЕДАЛЬ ПАДЛЯШСКАГА ВАЯВОДСТВА – ПАДСУМАВАННЕ МАЁЙ 40-ГАДОВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

15 студзеня ў Беластоку, падчас урачыстасцяў з нагоды 20-й гадавіны Закона аб нацыянальных і этнічных меншасцях і рэгіянальнай мове, культурніцкі дзеяч Падляшша і кіраўнік музея “Малой бацькаўшчыны” ў Студзіводах Дарафей Фіёнік атрымаў ганаровы медаль Падляшскага ваяводства.

Як адзначыў лаўрэат, для яго гэтая ўзнагарода стала сімвалічным падсумаваннем чатырох дзесяцігоддзяў дзейнасці на Падляшшы:

“Гэты медаль павешу ў музеі. Добра пачаўся год. Гэты год у нас юбілейны, бо музей “Малой бацькаўшчыны” ў Студзіводах якраз адзначае ў 2026 годзе 40 гадоў ад з’яўлення ідэі ў 1986-м. Тады ўзнікла думка ў 18-гадовага вучня гаспадарчага тэхнікума ў Бельску адкрыць музей у доме сваіх прадзедаў, які дастаўся мне ў спадчыну. Падумаў, зраблю сабе музей. І так зрабіў”.




Урачыстасці ў Беластоку сталі нагодай не толькі для ўшанавання асобных дзеячаў, але і для шырэйшай размовы пра ролю нацыянальных і этнічных меншасцяў у Падляшскім ваяводстве. Падчас мерапрыемстваў гучалі выступы прадстаўнікоў уладаў і грамадскіх арганізацый, адбылася дыскусійная панэль пра значэнне, гісторыю і перспектывы дзеяння закона, які ўжо два дзесяцігоддзі застаецца адным з ключавых інструментаў абароны культурнай і моўнай разнастайнасці ў Польшчы.

racyja.com

# ДУЭТ SW@DA X NICZOS АТРЫМАЎ ПРЭСТЫЖНУЮ КУЛЬТУРНІЦКУЮ ПРЭМІЮ ПОЛЬШЧЫ

11 студзеня ў Польшчы былі абвешчаныя лаўрэаты прэстыжнай прэміі ў галіне культуры Paszporty POLITYKI.

У катэгорыі “Папулярная музыка” ўзнагароду атрымаў дуэт з Падляшша Sw@da x Niczos – музыкі спяваюць на падляшскай гаворцы, якая лічыцца адным з дыялектаў беларускай мовы.

Каментуючы ўзнагароду, удзельніца дуэту Ніка Юрчук сказала: “Гэта сігнал, што тое, што мы робім інтуітыўна і па-свойму, цэніцца шырэй”.

“На стрымінгах з’яўляецца больш за 100 тысяч трэкаў у дзень, гэта шмат і лёгка заблытацца, таму мы шукаем кропкі прывязкі або спасылкі. Другі раз атрымліваецца, што гэта – карані. Падляшскія, вельмі заблытаныя і па ідэнтычнасці, і па нацыянальнасці, але мы спадзяемся, што з гэтага заблытвання ўзнікаюць цікавыя рэчы. У гэтых каранёў таксама ёсць такая класная рыса – яны нашы. Мы думаем, што калі мы самі не будзем апавядаць пра Падляшша, то хтосьці можа прыдумаць нам гэты аповед. Вось чаму мы моцна трымаемся за нашу Падляшша Bounce Crew”, – прыводзіць Polityka словы другога ўдзельніка калектыву Віктара Шчыгеля.



euroradio.fm

навіны

# ПРАФЕСАР ВЯЧАСЛАЎ ШВЕД, ЗВОЛЬНЕНЫ З УНІВЕРСІТЭТА, ВЫДАЎ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЮ ПРА ГРОДНА

Гродзенскі гісторык і прафесар Вячаслаў Швед выдаў кнігу "Гісторыя Гродна. Энцыклапедыя", прысвечаную гісторыі горада над Нёманам. Працу над выданнем аўтар завяршыў у 2022 годзе, энцыклапедыя будзе даступная чытачам у электроннай версіі.

Кніга апублікаваная на сайце выдавецтва Варшаўскага ўніверсітэта.

У анатацыі да выдання адзначаецца, што Гродна – горад з больш чым тысячагадовай гісторыяй, які перажыў войны і перыяды росквіту, і заслугоўвае ўласнай энцыклапедыі. Аўтар імкнуўся паказаць гісторыю горада праўдзіва і аб'ектыўна, абапіраючыся на даступныя крыніцы і навуковую літаратуру. Кніга напісана на беларускай мове.

Паводле інфармацыі ўніверсітэта, Вячаслаў Швед працуе на факультэце прыкладной лінгвістыкі і ў Інстытуце міжкультурных даследаванняў Цэнтральна-Усходняй Еўропы.




### Гісторык Гродна і ўніверсітэцкая кар'ера

Вячаслаў Швед скончыў гістарычны факультэт БДУ ў 1979 годзе. Больш за 30 гадоў яго навуковая і выкладчыцкая дзейнасць была звязана з Гродзенскім дзяржаўным універсітэтам імя Янкі Купалы, дзе ён працаваў прафесарам, быў загадчыкам кафедры беларускай культуры і рэгіянальнага турызму.

Ён абараніў кандыдацкую дысертацыю ў 1984 годзе і доктарскую – у 2001-м, спецыялізуючыся на гісторыі Беларусі XVIII–XIX стагоддзяў.

### Падручнік "Гродназнаўства" і звальненне ў Гродне

Адным з ключавых праектаў Шведа стала кніга "Гродназнаўства. Гісторыя еўрапейскага горада" – першы ў Беларусі падручнік па гісторыі канкрэтнага горада, створаны для школьнага курсу "Гродназнаўства". Аднак менавіта з-за гэтай кнігі прафесар быў звольнены з Гродзенскага ўніверсітэта.

Пасля выхаду кнігі яе асобнікі былі канфіскаваныя, а сам прафесар у 2013 годзе быў звольнены з універсітэта. Прафесар публічна заявіў, што звальненне насіла палітычны характар, і выступіў з адкрытым лістом да сваіх калег, дзе папрасіў аб дапамозе.

"Маё звальненне з'яўляецца палітычным рашэннем – помстай за выдадзеную кнігу "Гродназнаўства. Гісторыя еўрапейскага горада". Гэта кніга была напісана па маёй ініцыятыве, я стварыў калектыў аўтараў, кіраваў ім, напісаў больш за палову кнігі, рэдагаваў яе".

Швед адзначаў, што падручнік двойчы выдаваўся ў Гродзенскім універсітэце, а трэцяе выданне выйшла ва Уроцлаве ў друкарні Польскай акадэміі навук пасля таго, як у аблвыканкаме не ўдалося атрымаць фінансаванне. Мясцовыя ўлады тады абвінавацілі яго ў "падпольным выданні" кнігі. Прафесар назваў абвінавачванні неабгрунтаванымі і падкрэсліваў, што ў Польшчы была выдадзена кніга, а не падручнік.

### Навуковая праца за межамі Беларусі

Пасля звальнення, паводле слоў гісторыка, ён не мог два гады ўладкавацца на працу ў Беларусі. У 2015 годзе ў Польшчы быў адкрыты Цэнтр беларускіх даследаванняў для беларускіх навукоўцаў, звольненых па палітычных матывах. Ініцыятарамі стварэння цэнтра сталі Вячаслаў Швед і Алесь Смалянчук.

Пазней стала вядома, што цэнтр будзе падтрымліваць МЗС Польшчы.

hrodna.life

# "КНІГА ПРА ВОЛЬНЫХ КУПАЛАЎЦАЎ – ГЭТА АРХІЎ, АДКЛАДЗЕНЫ ДА ЧАСУ"

У выдавецтве Універсітэта Марыі Кюры-Складоўскай у Любліне выйшла кніга тэатразнаўцы Ірыны Лапо "Wolni Kupalowcy. Teatr narodowy na wygnaniu", прысвечаная гісторыі Вольных купалаўцаў пасля 2020 года. Даследаванне разглядае досвед беларускага тэатра ў выгнанні: разрыў з дзяржаўнай інстытуцыяй і фарміраванне новай супольнасці "нацыянальнага" тэатра, з захаваннем яго ў этычным і сімвалічным сэнсе.

Кажа аўтарка, Ірына Лапо:"Вольныя купалаўцы сезон за сезонам рабілі новыя спектаклі і сталі такой прыкметнай з'явай нават у польскім тэатры, на польскай перспектыве, на польскім гарызонце. Каб яшчэ ўзмацніць гэтую з'яву і каб яшчэ больш людзей пра іх даведалася і каб захаваць тое, што яны робяць".

Тэатр нацыянальны, і ён застаецца ў руках гэтай трупы, а не ў руках тых, хто трымае будынак.

Пры гэтым аўтарка падкрэслівае, што ў друкаваную версію не ўвайшла частка матэрыялаў з меркаванняў этычнай адказнасці. Польская мова выдання, паводле даследчыцы, з'яўляецца адначасова сродкам звароту да польскага чытача і формай абароны: як для герояў кнігі, так і для самога даследавання.

На сайце ibuk.pl можна набыць кнігу ў фармаце pdf.

Wolni Kupałowcy. Teatr narodowy na wygnaniu – Irina Lappo – pdf – Ibuk.pl

Папяровую версію можна будзе неўзабаве набыць на старонцы Wydawnictwo UMCS (wydawnictwo.umcs.eu).

racyja.com




Беларускія мерапрыемствы па ўсім свеце @Budzma_razam_bot

навіны

# ДЗЕЦІ Ў ЛІТВЕ СТВАРЫЛІ ДВУХМОЎНУЮ КНІГУ З ГУЛЬНЯМІ

Віленская школа "Стэмбрыдж" заснавала ўласнае выдавецтва Stembridge Books і ўжо выпусціла некалькі кніг. У канцы 2025 года выйшла з друку беларуска-літоўская кніга "Ха-Хэй-Хо: 22 вясёлыя гульні / linksmi zaidimai", у стварэнні якой удзельнічалі вучні другога класа.

"Ха-Хэй-Хо: 22 вясёлыя гульні" – гэта запрашэнне ў свет гульняў, дзе пануюць смех, радасць і сяброўства. Яе стварылі дзеці – вучні Stembridge School – разам з акторам Іллём Ясінскім і настаўніцай Наталляй Сялецкай. Рэдактарам выступіў Андрэй Скурко.

У кнізе чытачы знойдуць 22 жывыя гульні, якія вучаць рухацца, слухаць, адчуваць сябе і іншых. І самае галоўнае – весяліцца разам. Акрамя таго, гульні падзелены па тэмах: дыханне, цела, кантакт, артыкуляцыя, увага і фантазія, каб любы мог хутка знайсці тое, што патрэбна менавіта зараз: супакоіцца, узбадзёрыцца, наладзіць сувязь з іншымі або проста пераключыцца і вярнуць сабе адчуванне цела.

Кніга прадаецца ў краме Hartajka, а таксама можна замовіць дастаўку па Вільні, Літве, Еўропе.

bellit.info




# ТВОРЧЫ ВЕЧАР ПАЭТА АНАТОЛЯ ГАЛЕРА ПРАЙШОЎ З АНШЛАГАМ

14 студзеня ў Фарштадскай культурнай прасторы Цэнтра нацыянальных культур (вул. Відзэмес, 41а) адбылася творчая вечарына паэта і барда Анатоля Галера "Вершы як адлюстраванне душы", прымеркаваная да 75-гадовага юбілею.

Творчасць, каханне, гумар і сатыра, пейзажная лірыка, філасофія жыцця – такія тэмы знайшлі адлюстраванне ў вершах і песнях А. Галера. Аўтар з захапленнем расказаў пра свой жыццёвы і творчы шлях, чытаў свае вершы і выконваў песні.

Музычным падарункам прагучалі песні на словы паэта ў выкананні салістаў Аляксея Прывалава і Святланы Трафімавай, дуэтаў Алены Віткевіч і Валерыя Ермачэнкі, Рэгіны Родзікавай і Тацщяны Багданавай, ансамбля беларускай народнай песні "Купалінка".

Літаратурна-музычная вечарына "Вершы як адлюстраванне душы" прайшла з аншлагам і сабрала шматлікіх аматараў паэтычнага слова. Паэта цёпла павіншавалі арганізатары мерапрыемства, прадстаўнікі даўгаўпілскіх пісьменніцкіх і грамадскіх арганізацый.



Арганізатар – Цэнтр нацыянальных культур установы "Палац культуры Даўгаўпілса" Даўгаўпілскага дзяржаўнага гарадскога самакіравання.

bkc.daugavpils.lv

# СІНГЛ БЕЛАРУСКАГА ГУРТА MOLCHAT DOMA АТРЫМАЎ "ЗАЛАТЫ" СТАТУС У ЗША

Мінскі постпанк-гурт Molchat Doma выклаў відэа "распакоўкі" афіцыйнага дыплома ад Амерыканскай асацыяцыі гуказапісвальных кампаній (RIAA) – сертыфіката, які пацвярджае "залаты" статус іх сінгла ў Злучаных Штатах.

Сінгл "Sudno" перавысіў 500 000 копій, прададзеных у Злучаных Штатах, што дазволіла гурту атрымаць залаты дыск ад RIAA.

Кампазіцыя "Sudno" вызначаецца змрочным меланхалічным вайбам і апісвае паміранне чалавека ў бальніцы. Гэта кавер верша "Эмаляванае судна" рускага паэта Барыса Рыжага, які скончыў жыццё самагубствам ва ўзросце 26 гадоў.



Molchat Doma – беларускі рок-гурт з Мінска, які спалучае ў сваёй творчасці постпанк, сінціпоп і нью-вэйв. На сёння ён з'яўляецца адным з найпапулярнейшых рускамоўных калектываў у Еўропе.

reform.news

навіны

# Аляксей Францкевіч: 2026 год – наш шанц зрушыць прававыя праблемы



Беларусы, якія выбралі Украіну месцам жыхарства, апынуліся ў вельмі складанай сітуацыі. Краіна абараняецца ад расейскай агрэсіі, але пакуль не можа прапанаваць усе гарантыі, якія прадугледжваюць краіны Еўрасаюза для сваіх жыхароў.

2026 год – шанц нарэшце зрушыць прававыя праблемы беларусаў ва Украіне. Пра магчымасці, якія адкрываюцца з новым годам, і пра канкрэтныя крокі, якія можна зрабіць ужо цяпер, расказвае кіраўнік фонду “Вільна Білорусь” і грамадскага саюза “Беларуская супольнасць Украіны” Аляксей Францкевіч.

Аляксей нядаўна ўвайшоў у склад Экспертнай рады пры Прадстаўніку Упаўнаважанага Вярхоўнай Рады Украіны па правах чалавека ва Львоўскай вобласці і быў узнагароджаны адзнакай Прэзідэнта Украіны “За оборону України” – прызнанне яго працы па падтрымцы беларусаў ва Украіне і садзейнічанні ў абароне правоў чалавека.

**– Зараз вы знаходзіцеся ў Львове. Раскажыце пра сам настрой у горадзе напярэдадні Раства Хрыстова, колькі каталікаў, колькі праваслаўных у горадзе, які ўвогуле настрой на фоне вайны.**

– Тут багата каталікаў – рыма-каталікаў, грэка-каталікаў. Я думаю, што больш тут усё ж грэка-каталікаў. Як заўсёды будуць хадзіць і калядаваць па хатах, дзеці будуць хадзіць. Усё як заўсёды, нягледзячы на вайну, жыццё працягваецца. Нічога не змянілася.

**– Тады давайце падвядзем з вамі вынікі працы і фонду “Вільна Білорусь” і беларускай супольнасці ва Украіне. З чым вы ідзяце ў 2026 год, якія агулам планы на гэты перыяд?**

– Планаў вельмі шмат. У 2025 годзе нам удалося тут зарэгістраваць грамадскую арганізацыю “Білоруська спільнота України”. У 12 рэгіёнах Украіны мы знайшлі сваіх прадстаўнікоў.

У гэтым годзе будзем далей працягваць працу. Працы шмат. Гэта адносна і прававога статусу беларусаў, таму што ў гэтым пытанні вельмі шмат праблем, з якімі сутыкаюцца беларусы. У першую чаргу гэта пратэрмінаваныя беларускія пашпарты.

Мы запускаем афлайн нядзельную школку беларускай мовы. Запускам анлайн-курсы беларускай мовы. Пакуль гэта будзе адзін раз на тыдзень. Калі будзем бачыць патрэбу, можам зрабіць і два разы на тыдзень. Будуць адбывацца анлайн-заняткі беларускай мовы.

Будзем працягваць займацца папулярызацыяй беларускіх герояў, якія аддалі ва Украіне свае жыцці. У нас ужо існуе тры выставы. Адна зараз працягвае сваю працу ў Кіеўскім нацыянальным універсітэце. Другая – у нацыянальным тэхналагічным універсітэце ў Луцку. І выставы будуць далей вандраваць па Украіне.

Будзем распавядаць і пра гісторыю беларускага супраціву, і пра беларускіх герояў.

Будзем працягваць працу па дапамозе дзецям загінулых герояў. На жаль, на сённяшні дзень гэта ўжо 17 дзяцей, пра якіх мы ведаем, якія жывуць ва Украіне. Таму працы шмат. Будзем працаваць далей. І самае галоўнае – будзем набліжаць нашую агульную перамогу.

racyja.com

# У “Доме вольнай Беларусі” ў Львове ўшанавалі памяць Міхаіла Жызнеўскага

У пятніцу ў “Доме вольнай Беларусі” ў Львове ўшанавалі памяць Міхаіла Жызнеўскага і беларускіх добраахвотнікаў, якія загінулі, бароначы Украіну ад расейскай агрэсіі, паведаміла Львоўская абласная рада.

У мерапрыемстве ўзялі ўдзел дэпутаты рады, прадстаўнікі беларускай супольнасці і грамадскія дзеячы.

Загінулых ушанавалі хвілінай маўчання. Святар адслужыў паніхіду. Адбыўся паказ фільма пра Міхаіла Жызнеўскага. Выступілі дэпутаты Львоўскай абласной рады.

У “Доме вольнай Беларусі” цяпер захоўваецца і помнік Міхаілу Жызнеўскаму, які першапачаткова стаяў на месцы ягонай гібелі ў Кіеве. Таксама тут можна пабачыць рэчы, узнагароды, лісты іншых загінулых герояў.

Дэпутатка Кацярына Кэньо падзялілася ўспамінамі пра пахаванне Міхаіла:

“Мы разумелі, што ідзе барацьба за праўду, за волю, за святло. На пахаванне Міхаіла Жызнеўскага прыйшлі тысячы людзей. Тады мы ўсвядомілі, што свабоду не спыніць”.

Прадстаўнік Упаўнаважанага Вярхоўнай Рады Украіны па правах чалавека ў Львоўскай вобласці Тарас Падвірны апавёў, што робіцца для легалізацыі беларускіх добраахвотнікаў:

“Разам з імі працуем над тым, каб ліквідаваць



Львівська обласна рада (Public domain)

юрыдычныя перашкоды для іх знаходжання ва Украіне. У мінулым годзе мы перадалі ў МУС 25 спраў, і зараз гэтыя пытанні абмяркоўваюцца на найвышэйшым узроўні”.

Беларускія актывісты Львова прапаноўвалі ўсталяваць помнік Жызнеўскаму ў адным з львоўскіх сквераў. Але ў нядаўнім інтэрв’ю “Радыё Свабода” мэр горада Андрэй Садавы сказаў, што помнік пакуль ставіць не будуць:

“Ідэя цікавая, але падчас вайны мы прыпынілі ўсталяванне помнікаў. Мы ўшаноўваем тых, хто аддаў сваё жыццё сёння ў гэтай вайне, падтрымліваем сем’і, прымаем шмат параненых, вельмі шмат перасяленцаў, гэта наш сённяшні прыярытэт. А калі будзе перамога, тады будзем размаўляць. Усяму свой час”.

svaboda.org

**навіны**

# НАВАГОДНІЯ ПАДАРУНКІ ДЛЯ БЕЛАРУСКІХ ДЗЯЦЕЙ ВЕТЭРАНАЎ ВАЙНЫ ВА УКРАІНЕ

9 сертыфікатаў па 100 еўра на пакупкі ў гандлёвым цэнтры "Акрапаліс", адзін асабісты падарунак па замове з Дзедам Марозам, ласункі і квіток у тэатр. Такі вынік калядна-навагодняй акцыі для беларускіх дзетак ветэранаў вайны ва Украіне ў Літве. Дабрачынная арганізацыя "Кусь" у межах ініцыятывы "Росквіт" сабрала на гэта 1186 еўра.

Распавядае былы добраахвотнік і сузаснавальнік дабрачыннай арганізацыі "Кусь":

"Акцыя прайшла паспяхова. Збор мы закрылі нават трошкі раней, чым разлічвалі, прыкладна за тыдзень да Новага года. Мы сабралі 1186 еўра. Дадаткова мы атрымалі яшчэ невялікія падарункі ад дэпутатаў літоўскага Сейма. Больш сімвалічныя, але таксама тут важна, што не абышлі ўвагай літоўскія дэпутаты дзяцей ветэранаў вайны ва Украіне".

Нагадаем, дабрачынная арганізацыя "Кусь" і ініцыятыва "Росквіт" працуе ўжо два гады ў Вільні, заснаваная Аляксандрам Клачко і яго жонкай Любай. Усе справаздачы па зборах і акцыях яны публікуюць у сацыяльных сетках, у тым ліку і ў інстаграме. Падпісацца на старонку можна па спасылцы: instagram.com/roskvitkus/

racyja.com

**in memoriam**

# ПАМЕРЛА ІРЫНА БЫКАВА – УДАВА ВАСІЛЯ БЫКАВА

У Мінску памерла Ірына Быкава, удава народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава. Пра гэта паведаміў у сваім тэлеграм-канале журналіст Сяргей Навумчык.



Ірына Міхайлаўна доўгія гады набірала творы Васіля Быкава на друкарскай машынцы, вычытвала ягоныя тэксты.

Пасля смерці мужа Ірына Міхайлаўна прысвяціла сябе захаванню яго літаратурнай спадчыны.

У 2003 годзе, калі пісьменнік памёр неўзабаве пасля вяртання з эміграцыі ў Беларусь, яна ў Доме літаратара забараніла прыбраць з ягонай труны нацыянальны бел-чырвона-белы сцяг, тады прадстаўнікі праўладнага Саюза пісьменнікаў дэманстратыўна пакінулі цырымонію. Развітанне з Васілём Быкавым прайшло цалкам пад бел-чырвона-белымі сцягамі, піша "Радыё Свабода".

У канцы снежня 2025 года Ірына Міхайлаўна трапіла ў шпіталь з пераломам сцягна і інфарктам.

13 студзеня 2026 года ёй споўнілася 99 гадоў, яна перажыла мужа амаль на чвэрць стагоддзя. Васіля Быкава не стала ў чэрвені 2003 года.

budzma.org

# ПАМЕРЛА МАЦІ КАЦЯРЫНЫ ВАДАНОСАВАЙ

Памерла маці вядоўцы ютуб-канала "Будзьма беларусамі!" Кацярыны Ваданосавай. Пра гэта Кацярына паведаміла на сваёй старонцы ў фэйсбуку. Напярэдадні Калядаў у Нэлі Ваданосавай адбылося кровазліццё ў мозг, ёй зрабілі аперацыю, але жанчына так і не прыйшла ў свядомасць.



"34 гады мая мама чакала сустрэчы з маім татам. Спадзяюся, яны ўжо разам. А я цяпер круглая сірата. Мама памерла", – напісала ў фэйсбуку Кацярына Ваданосава ўвечары 1 студзеня.

23 снежня ў Нэлі Ваданосавай здарыўся інсульт. Дактары прыехалі хутка, адвезлі яе ў бальніцу, там зрабілі аперацыю, але жанчына так і не прыйшла ў сябе.

"Маю маці падключылі да апарату штучнай вентыляцыі лёгкіх і да іншых сістэм забеспячэння жыццядзейнасці. Але мозг пашкоджаны незваротна, у нас застаўся толькі адзіны шлях", – напісала тады Кацярына Ваданосава.

Нэлі Ваданосава чакала рашэння па міжнароднай абароне. Як высветлілася, Ужонд па справах уцекачоў не ўнёс яе ў базу забяспечаных страхоўкай, і Кацярына не ведала, ці зможа дамагчыся яе забеспячэння. Кацярына апасалася, што рахунак за аперацыю і іншыя медычныя паслугі можа скласці ад дзясяткаў да сотняў тысяч злотых. У сувязі з гэтым быў адкрыты тэрміновы збор на падтрымку Нэлі Ваданосавай. Суму, заяўленую ў зборы, закрылі за няпоўныя тры дні.

У верасні 2025 года Нэлі Ваданосаву збіраліся дэпартаваць з Польшчы ў Літву на падставе Дублінскага пагаднення. Але Варшаўскі адміністрацыйны суд прыпыніў выкананне пастановы, і жанчына засталася з сям'ёй у Беластоку.

**Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына" выказвае шчырыя спачуванні Кацярыне Ваданосавай, а таксама родным, блізкім і ўсім, хто ведаў спадарыню Нэлі Ваданосаву.**

## Беларускі каляндар памятных дат на люты 2026 года

1 лютага
- 215 гадоў таму, у 1811-м, нарадзіўся Рамуальд Зянькевіч, этнограф, археолаг. Памёр у 1868-м.
- 35 гадоў таму, у 1991-м, памёр Станіслаў Шушкевіч, пісьменнік.

2 лютага
- 165 гадоў таму, у 1861-м, памёр Міхаіл Гамаліцкі, лекар, гісторык.
- 30 гадоў таму, у 1996-м, памёр Алесь Звонак, пісьменнік.
- 20 гадоў таму, у 2006-м, памёр Пётр Марціноўскі, літаратуразнавец.

4 лютага
- 95 гадоў таму, у 1931-м, забіты Усевалад Ігнатоўскі, гісторык.

5 лютага
- 90 гадоў таму, у 1916-м, нарадзілася Валянціна Пашкевіч (дзяв. Жукоўская), дзячка эміграцыі ў Канадзе. Памерла ў 2004-м.
- 25 гадоў таму, у 2001-м, памёр Масей Сяднёў, літаратар, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

6 лютага
- 120 гадоў таму, у 1906-м, нарадзіўся Тамаш Падзява, каталіцкі святар-марыянін, філосаф, тэолаг. Памёр у 1975-м.

8 лютага
- 200 гадоў таму, у 1826-м, нарадзіўся Аляксандр Валіцкі, выдавец, спявак. Памёр у 1893-м.
- 160 гадоў таму, у 1866-м, нарадзіўся Васіль Дружчыц (Друшчыц), гісторык. Расстраляны ў 1937-м.
- 105 гадоў таму, у 1921-м, нарадзіўся Іван Мележ, пісьменнік. Памёр у 1976-м.

13 лютага
- 220 гадоў таму, у 1806-м, нарадзіўся Юльян Корсак, паэт. Памёр у 1855-м.

14 лютага
- 120 гадоў таму, у 1906-м, нарадзіўся Мікола Улашчык, гісторык, літаратар. Памёр у 1986-м.

15 лютага
- 100 гадоў таму, у 1926-м, нарадзіўся Мікола Ягаўдзік, вайсковец, дзеяч эміграцыі ў Бельгіі і ЗША. Памёр у 1989-м.

17 лютага
- 220 гадоў таму, у 1806-м, нарадзіўся Канстанцін Тышкевіч, археолаг. Памёр у 1868-м.
- 110 гадоў таму, у 1916-м, памерла Цётка (сапр. Алаіза Пашкевіч, па мужу Кайрыс), паэтэса, выдавец.

18 лютага
- 70 гадоў таму, у 1956-м, памёр Янка Быліна (сапр. Ян Семашкевіч), каталіцкі святар, пісьменнік.

19 лютага
- 125 гадоў таму, у 1901-м, нарадзіўся Сяргей Бусел, адзін з кіраўнікоў Слуцкага паўстання.

23 лютага
- 135 гадоў таму, у 1891-м, нарадзіўся Міхаіл Піятуховіч, літаратуразнавец. Расстраляны ў 1937-м.

25 лютага
- 120 гадоў таму, у 1906-м, нарадзіўся Павел Каруза, кампазітар, этнамузыказнавец. Памёр у 1988-м.
- 40 гадоў таму, у 1986-м, памёр Ізыдар Гуткоўскі (сапр. Плашчынскі), літаратуразнавец.

**Беларусы ў свеце**
№ 1 (284), студзень 2026
Інфармацыйны бюлетэнь
Супольнасць беларусаў свету "Бацькаўшчына"

Распаўсюджваецца на правах унутранай дакументацыі.
Меркаванні аўтараў могуць не супадаць з думкай рэдакцыі.

Адказныя за нумар – Н. Шыдлоўская, А. Макоўская

Наклад 250 асобнікаў

zbsb.info e-mail: zbsb.minsk@gmail.com